для сімфанічнага аркестра, скрыпкі, габоя, віяланчэлі і фартэпіяна, у аснове якога ляжыць “Аповесць мінулых гадоў”, харавога канцэрта “Пахвала Вялікаму князю Уладзіміру Святаслававічу”, канцэрта для хору “Вячэрняя малітва” (словы С.Грахоўскага) і інш. Карыстаючыся новымі выразнымі сродкамі, дасягненнямі ў галіне кампазітарскай тэхнікі, А.Бандарэнка стварае сучасную канцэпцыю духоўнай музыкі. У 90-я гады XX ст. ім напісаны “Літургія св.Іаана Златавуста”, “Малітва на замірэнне варагуючых”.

Музыка айца Андрэя адлюстроўвае яго разуменне вобразнай сферы кананічнага тэксту і можа быць для некаторых складанай для ўспрымання У аснове яго музыкі — інтанацыі старажытнага аднагалосся, толькі ажыццяўляюцца яны ў гарманічнай тэмбравай форме. Гукавая палітра духоўных твораў кампазітара тонкая, разнастайная, маляўнічая; акварэльнасць спалучаецца і з ювелірным мазком, і з шырокай меладычнай фразай.

Праваслаўная музыка нясе дух пакорлівасці, любові да Бога, людзей. Прыгажосць гэтай музыкі -- духоўная, што і ёсць сапраўдная прыгажосць, як вучаць айцы царквы.

**Калацэй В.В.,**
*аспірант кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## ПРА ЭТНАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ВОПЫТУ ВЫВУЧЭННЯ ПЕСЕННАЙ КУЛЬТУРЫ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ

Песенная культура Паўночнай Беларусі мае даволі працяглую гісторыю вывучэння. У этнаграфічных выданнях канца XIX—пач. XX ст. песням Віцебшчыны ўжо было адведзена значнае месца. Між тым вядома: любая з‘ява культуры пераходзіць у акадэмічных ведах у больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трывалую катэгорыю пасля грунтоўнага, якаснага, усебаковага яе вывучэння. Звычайна гэта адбываецца пасля з'яўлення пра яе манаграфіі.

Песенная культура беларускай Поўначы перайшла гэтую мяжу ў 1981 г., калі была выдадзена кніга "Песні Беларускага Паазер'я" З.Мажэйкі. Такім чынам, беларуская этнаграфія, этнамузыказнаўства ніколі не пакідалі без увагі музыку Падзвіння. Але з пункту гледжання этналогіі, калі ўспрымаць яе як параўнанне розных культур на тэарэтычным падмурку, важна тое, што спевы беларускай Поўначы цікавяць не толькі беларусаў. У гэтым кантэксце хацелася б звярнуць увагу на існуючыя ў навуковай літаратуры Беларусі, суседніх краін меркаванні наконт асобных відаў раннетрадыцыйнай класікі паўночна-беларускіх песень.

Звычайна даследчыкі падкрэсліваюць, што паўночнабеларускі мелас грунтоўна звязаны з меласам поўдня Літвы, асабліва цесна ў найбольш архаічных, старажытных яго формах каляндарных працоўных песнях. Адной з першых на сувязь паміж раннімі слаямі меласаў Паўднёва-Усходняй Літвы і Беларусі звярнула ўвагу Ядвіга Чурліянітэ ў сваіх навуковых працах па літоўскім музычным фальклоры. У рознай ступені гэтае пытанне закраналі В.Бараўскене, Р.Дрызуле, З.Мажэйка і інш. Адзначалася неабходнасць больш дэталёвага, на дыялекталагічным узроўні, даследавання з'явы. Адным з крокаў у азначаным кірунку можна лічыць гэты артыкул. Яго мэтаю з'яўляецца спроба ўдакладніць кола пытанняў, што тычацца асноўнай тэмы ў агульнакультуралагічным плане.

У беларускім і ў літоўскім этнамузыказнаўстве, увогуле ў фалькларыстыцы традыцыйна склаліся неаднолькавыя падыходы да каляндарнай і працоўнай песеннай абраднасцей. Жанравы падзел у працах беларускіх даследчыкаў мае каляндарную "дамінанту". Літоўцы ў пытаннях класіфікацыі акцэнтуюць працоўную прымеркаванасць напеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на пэўныя цяжкасці, якія выклікае такое становішча пры параўнанні, відавочна: асноўны масіў каляндарных і працоўных напеваў сумежжа Беларусі і Літвы складаецца з функцыянальных груп, характэрных для абедзвюх рэгіянальных традыцый.

Амаль кожная з функцыянальных груп (напрыклад, калядкі, валачобныя, ворныя, песні пры ўборцы грэчкі і інш.) сустракаецца ў матэрыялах і па Паазер'і, і па Дзукіі, прычым часта ў суправаджэнні аднолькавай ці падобнай абраднасці. Ступень музычнага падабенства варыянтна змяняецца — ад прамых аналогій (пэўныя тыпы валачобных, жніўных песень) да рознай ступені роднаснасці рытмічнай структуры (гэта звычайна датычыцца напеваў маторнага тыпу) або ладава-меладычнай асновы і інтанацыйнага комплексу (напевы тыпу маўлення).

У навуковай літаратуры многа артыкулаў пра падабенства літоўскіх і беларускіх жніўных песень. Разам з тым адзначаецца: безумоўна родпасны літоўскаму латышскі народ мае багаты рэпертуар жніўных песень, але ў ім мала мелодый, блізкіх літоўскім. Нашы суседзі палякі і расіяне песень пра жніво амаль не ведаюць, захавалі толькі дажынкавыя. Зноў жа, не маюць сваіх велікодных аналогій у суседзяў беларускі валачобны абрад, літоўскі "лалавімас", аднак, бясспрэчна, падобныя беларускія і літоўскія песні, якія суправаджаюць гэтыя абрады.

Пэўныя функцыянальныя групы песень, часцей музычна-абрадавыя комплексы, у даследаваннях нацыянальнага ўзроўню лічацца цалкам (або з агаворкамі) спецыфікай гэтых рэгіёнаў.

| Функцыянальныя групы песень | Арэалы пераважнага бытавання |
|---|---|
| Веснавыя масленічныя "калыскі" | Паазер'е |
| Льнавыя | Зах. Паазер'е |
| Літоўскія калядкі | Дзукія |
| Lalauninku (літ.валачобныя) | Дзукія |
| Jurginiu dainos (літ.юраўскія) | Усх. Дзукія |
| Заклікі вясны і "парутінэ" | Усх. Дзукія |
| Пастухоўскія галашэнні | Дзукія |
| Grikiu rovimo dainos (песні пры ўборцы грэчкі) | Дзукія |
| Ganumo dainos (песні пры выпасе валоў) | Дзукія |

Заслугоўвае ўвагі тое, што песенныя стылі Паазер'я і Дзукіі заснаваны цалкам на манодыі. Яна застаецца абавязковай умовай пры калектыўным выкананні. Літоўскія музыказнаўцы падкрэсліваюць таксама, што ў Паўднёвай Дзукіі амаль не захавалася слядоў існавання сутарціне — асобнага віду старажытнага літоўскага шматгалосся, пашыранага ў літоўскай традыцыі ў тых межах, якія дазваляюць лічыць яго этнавызначальнай з'явай.

Каляндарны і працоўны напеў даследчыкі лічаць "нязменным знакам-сімвалам" са строга акрэсленымі межамі варыяцыйных змен. Змены ў каляндарных напевах магчымы толькі ў тых межах, у якіх напеў працягвае ўспрымацца як "... нязменны знак-сімвал, па вызначэнні народных спевакоў, голас... каляды, масленіцы, азімага і яравога жніва..." і г.д. (З.Мажэйка). Разам з тым каляндарныя працоўныя і каляндарныя абрадавыя песні з'яўляюцца найбольш "нерухомымі", "неміграцыйнымі" і рухаюцца ў прасторы толькі разам з іх носьбітамі. Гэта адбываецца пры перамяшчэнні значных этнічных груп (паводле Л.Мухарынскай і Т.Якіменкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, увогуле каляндарная і працоўная абраднасці лічацца найбольш архаічнымі, "крышталізаванымі", менш зменёнымі ў параўнанні з іншымі ў прасторы, часе. Але ў адносінах канкрэтнай храналогіі яе існавання навукоўцы выказваюцца асцярожна.

Узнікненне каляндарна-абрадавых свят і напеваў, якія іх суправаджалі, адносяць да першабытна-абшчыннага ладу (паводле Я.Чурліянітэ). Яны — першая форма старажытнага протакалендара, якая гіпатэтычна магла з'явіцца яшчэ ў палеаліце (паводле С.Патупы), а больш разгорнутай, стабільнай стала падчас узнікнення жывёлагадоўлі і земляробства. Гэтыя формы гаспадаркі на рубяжы III—II тысячагоддзяў да н.э. прынеслі на тэрыторыі беларуска-літоўскага сумежжа індаеўрапейскія плямёны. Існуе меркаванне, што прадстаўнікі сярэднедняпроўскай археалагічнай культуры, пра якіх ідзе гаворка, былі ўжо носьбітамі балтыйскіх моў (паводле Э.Загарульскага).

Да спадчыны якіх з археалагічных культур — сярэднедняпроўскай або пазнейшых, вісла-нёманскай і культуры штрыхаванай керамікі, або ўвогуле да нашмат пазнейшых часоў — аднесці карані паралелей у раннетрадыцыйнай класіцы песень сумежжа, зараз магчыма толькі меркаваць. Датаванне найбольш старажытных з вядомых даследчыкам сувязей паміж меласамі суседніх народаў — першыя стагоддзі да н.э. (паўднёвыя аўкштайты — фіны і эстонцы, (паводле Я.Чурліянітэ) або V—VII стст. н.э. (венгры-чувашы, (паводле З.Кодая). У абодвух выпадках час належыць да "балтыйскага" (паводле Э.Загарульскага) этапу гісторыі Беларусі. Таму тлумачыць роднасныя з'явы ў меласах сумежных рэгіёнаў толькі сярэднявечнымі і пазнейшымі запазычаннямі наўрад ці мэтазгодна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ